# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ЎВАХОДЖАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАД СССР (1939–1941 ГГ.)

***Д. А. Дзядзюля***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г.Мінск, Беларусь, dariadedyulya@gmail.com*

Артыкул прысвечаны пытанню ўз'яднання Заходняй Беларусі з СССР. На аснове дакументаў і апублікаванай літаратуры, аўтар разглядае першы этап фарміравання беларуска-польскай мяжы. У працы асвятляецца праблема правамернасці ўваходжання зямель Заходняй Беларусі ў склад СССР з пункту гледжання норм міжнароднага правы таго часу.

***Ключавыя словы:*** Другая сусветная вайна; Заходняя Беларусь; БССР; фарміраванне межаў; СССР.

# ПРАВОВОЕ РЕГУЛИРОВАНИЕ ВХОЖДЕНИЯ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В СОСТАВ СССР (1939–1941 гг.)

***Д. А. Дедюля***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, dariadedyulya@gmail.com*

Статья посвящена вопросу воссоединения Западной Беларуси с СССР. На основании документов и опубликованной литературы автор рассматривает первый этап формирования белорусско-польской границы. В статье рассматривается проблема легальности земель Западной Беларуси в составе СССР с точки зрения международного права того времени.

***Ключевые слова:*** Вторая мировая война; Западная Беларусь; БССР; формирование границ; СССР.

# LEGAL REGULATION OF THE ENTRY OF WESTERN BELARUS INTO THE USSR (1939–1941)

***D. Dziadziulia***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: dariadedyulya@gmail.com*

The article is devoted to the issue of the reunification of Western Belarus with the USSR. On the basis of documents and published literature, the author examines the first stage of the formation of the Belarusian-Polish border. The paper highlights the problem of the legitimacy of the entry of Western Belarus into the USSR from the point of view of international law of that time.

***Key words:*** World War II; Western Belarus; BSSR; formation of borders; USSR.

Праблема правамернасці ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад СССР (БССР) і сёння патрабуе аб'ектывнага асэнсавання. Па зразумелых прычынах найбольшую ўвагу на гэту тэму звяртаюць беларускія і польскія даследчыкі.

Доўгі час у савецкай гістарыяграфіі закраналіся толькі некаторыя аспекты гэтага пытання, якія асвятляліся аднабокава. Даследчыкі адназначна ацэньвалі

падзеі верасня 1939 года, як справядлівае аднаўленне цэласнасці беларускай этнічнай тэрыторыі, парушанай умовамі Рыжскай мірнай дамовы 1921 г. Аднак у апошнія гады ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы адбыліся значныя змены, перш за ўсё гэта аналіз ранейшых канцэпцый і адыход ад стэрэатыпаў. З гэтымі зменамі адбываліся першыя спробы пераасэнсавання гісторыі Заходняй Беларусі.

У працэсе фарміравання беларуска-польскай мяжы можна вылучыць некалькі этапаў, адзін з якіх ахоплівае верасень 1939 г. – чэрвень 1941г. З пачаткам Другой сусветнай вайны пачаўся перыяд кардынальных палітычных і сацыяльна-эканамічных зменаў у Заходняй Беларусі. Ва ўмовах складаных геапалітычных абставін у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе 23 жніўня 1939 г. урад СССР заключыў дагавор аб ненападзе з Германіяй, вядомы як пакт Молатава-Рыбентропа. Да дагавора дадаткова прыкладаўся «сакрэтны пратакол», згодна з якім Польшча, у якую ўваходзілі тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, дзялілася па лініі рэк Нараў, Вісла і Сан [6, с.7]. Дагавор быў ратыфікаваны Вярхоўным Саветам СССР, а на другі дзень, 1 верасня 1939 г., Германія пачала вайну супраць Польшы. У адпаведнасці з папярэднімі дамоўленасцямі для таго, каб «узяць пад абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны», 17 верасня Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу і заняла тэрыторыю Заходняй Беларусі. Гэта падзея паўплывала на далейшае фарміраванне беларуска-польскай мяжы і саветызацыі рэгіёну. Для таго, каб зразумець дакладнасць прававых падстаў ўваходжання зямель Заходняй Беларусі ў склад СССР, неабходна высветліць правамернасць асноўных дагавораў з пункту гледжання дзеючага закона таго часу.

Заключэнне савецка-германскага пакта аб ненападзе з'яўляецца адной з ключавых тэм гістарыяграфіі падзей 1939 года, аднак палеміка, якая датычыцца ацэнкі яго юрыдычнага боку, вельмі супярэчлівая. Так, на думку многіх даследчыкаў пакт Молатава-Рыбентропа (без дадатковага сакрэтнага пратакола), не разыходзіўся з дагаворнай практыкай СССР і ўяўляе тыповы дагавор аб ненападзе або нейтралітэце [4, с.151]. Але непрадузяты аналіз тэксту аналагічных пактаў (Савецка-фінскі дагавор аб ненападзе ад 21 студзеня 1932 года, Польска-савецкі пакт ад 25 ліпеня 1932 года, Пакт аб ненападзе паміж СССР і Францыяй ад 29 лістапада 1932 года і г.д.) дае высновы зразумець, што ёсць адна адметная рыса – гэта наяўнасць у дадзенных дагаворах палажэння аб дэнансаванні ў момант пачатку агрэсіі іншым бокам супраць трэцяй дзяржавы. У савецка-германскім дагаворы ад 23 жніўня 1939 г. такога палажэння не было [5, с.29]. Такім чынам, абодва бакі выразна ўсведамлялі, што падпісаны пакт не стрымлівае ад агрэсіі супраць іншых дзяржаў ні Германію, ні СССР. Сапраўды, у шматлікіх дамовах аб ненападзе, заключанных савецкім кіраўніцтвам раней, такі пункт быў. Аднак адсутнасць такога палажэння магло вызначацца не нормамі права, а палітычнай мэтазгоднасцю, што дазваляла ў далейшым распачаць дзеянні, накіраваныя на ўмацаванне бяспекі. Таму што палітыка калектыўнай бяспекі правалілася, і заставалася клапаціцца толькі пра сваю ўласную бяспеку, незалежна ад інтарэсаў іншых краін.

Зусім інакш было з сакрэтным дадатковым пратаколам да дамовы. Прадпрынятыя дзеянні СССР і Германіяй з'яўляліся сакрэтнай дамоўленасцю і старанна хаваліся ад усіх. У пратаколах ішла гаворка пра «сферу інтарэсаў»,

«тэрытарыяльна-палітычную перабудову», г.зн. аб тых тэрыторыях, дзе іншы ўдзельнік дамовы павінен ўтрымлівацца ад актыўных дзеянняў пры любым развіцці падзей (перш за ўсё эканамічнай экспансіі, ціску на ўладныя структуры і падтрымку паўстанцкіх рухаў). Але з пункту гледжання формы – падзел сфер інтарэсаў ў той час быў агульнапрынятай практыкай, нормай для дыпламатыі, і супярэчным дзеючаму міжнароднаму праву лічыцца не можа. Але 24 снежня 1989 г. адбыўся З'езд народных дэпутатаў СССР, на якім была дана палітычная і прававая ацэнка савецка-германскага дагавора аб ненападзе ад 23 жніўня 1939 г. Так, Міхаіл Гарбачоў асудзіў дадатковы сакрэтны пратакол і абвясціў яго «несапраўдным з моманту падпісання» [4, с.151]. Так ці інакш, пункт, у якім бы была інфармацыя пра «далучэнне ў склад СССР Заходняй Беларусі», адсутнічаў.

Наступнае размежаванне сфер інтарэсаў СССР і Германіі знайшло адлюстраванне ў падпісаным дагаворы 28 верасня 1939 г. «Аб дружбе і мяжы», у выніку якога савецкае кіраўніцтва адмаўлялася ад Люблінскага і часткі Варшаўскага ваяводстваў, а ўзамен да СССР пераходзіла Літва. Такім чынам, СССР атрымліваў уладу над усімі прыбалтыйскімі рэспублікамі і адсоўваў на гэтым адрэзку мяжу з Германіяй на поўдзень. У выніку палітычных камбінацый да заходнебеларускіх этнічных зямель былі далучаны заходнія паветы Беластоцкага ваяводства з пераважна польскім складам насельніцтва, а таксама Ломжынскі павет, ўсходнія часткі Астралэнскага і Остраў-Мазавецкага паветаў Варшаўскага ваяводства. Такім чынам, заходняя мяжа Беларускай ССР дайшла да Цісы [6, с.16].

У мэтах нейтралізацыі непажаданай рэакцыі літоўцаў і перамоваў з літоўскім міністрам замежных спраў Ю. Урбшысам, 10 кастрычніка 1939 г. быў падпісаны савецка-літоўскі дагавор, па якім Віленшчына з плошчай 6,9 тыс.км ад Заходняй Беларусі перадавалася Літве [8, с.127]. Аднак тым самым Літва фактычна страціла частку свайго суверэнітэту ў надзеі, што СССР гэтым задаволіцца. З перадачай Віленшчыны Сталіным былі груба парушаны Канстытуцыя СССР і Канстытуцыя БССР, таму што змена дзяржаўнай граніцы не магла быць праведзена без адпаведнага рашэння Вярхоўнага Савета Рэспублікі, але як сведчаць дакументы, пытанне змены граніцы ім не ставілася і не вырашалася.

Дэманструючы сваю «заклапочанасць» лёсам беларускага і украінскага народаў, а таксама для вырашэння пытанняў па ўсталяванні новай дзяржаўнай улады, ЦК УКП(б) прыняў пастанову «Пытанні Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі» з 33 пунктаў. Першы пункт пастановы абавязваў склікаць Украінскі Народны сход у Львове і Беларускі Народны сход у Беластоку з выбарных па абласцях Заходняй Беларусі (тэрыторыя былых ваяводстваў Навагрудскага, Віленскага, Беластоцкага і Палескага) [6, с.19–20]. Выбары праходзілі цалкам пад кантролем органаў кампартыі і НКУС. Кандыдатуры дэпутатаў праходзілі строгі адбор на лаяльнасць новай улады. Галоўным кіраўніком усіх пераўтварэнняў пад лозунгам аб'яднання беларускага народа з'яўлялася Масква. Беларускі Народны сход павінен быў вырашыць пытанні аб характары будучай улады, уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, а таксама пераўтварэннях, якія ўжо пачаліся – нацыяналізацыі банкаў і буйнай прамысловасці [2, с.5].

29 кастрычніка 1939 г. у Беластоку Народны сход прыняў Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР і «ўз'яднаць тым самым беларускі народ у адзінай беларускай дзяржаве». 2 лістапада 1939 года Вярхоўны Савет

СССР, а 14 лістапада 1939 г. Вярхоўны Савет БССР заканадаўча афармілі ўключэнне Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб'яднанне з Беларускай ССР. Указам Прэзідыўма Вярхоўнага Савета СССР ад 29 лістапада 1939 г. усе грамадзяне заходніх абласцей Украінскай і Беларускай ССР, якія знаходзіліся на іх тэрыторыі 1–2 лістапада 1939 г., атрымлівалі грамадзянства СССР [1, с.244]. Нягледзячы на ціск савецкіх уладаў гэтыя рашэнні ў цэлым адказвалі тагачасным настроям і жаданням пераважных мас мясцовага насельніцтва. Таму іх можна лічыць легітымнымі. З гэтага моманту ў жыцці насельніцтва заходніх абласцей пачаўся новы перыяд.

Нягледзячы на прынятыя заканадаўчыя акты, надзея Прыбалтыкі на захаванне незалежнасці не спраўдзілася. Працэсы нацыянальна-тэрытарыяльных пераўтварэнняў працягнуліся. У чэрвені 1940 г. Эстоніі, Латвіі і Літве былі прад'яўлены абвінавачванні ў парушэнні «Дагавораў аб узаемнай дапамозе» і ультыматумы з патрабаваннем сфармаваць ўрады, якія здольны забяспечыць іх выкананне, а таксама дапусціць на свае тэрыторыі дадатковы вайсковы кантынгент. Нічога не заставалася, як выканаць гэтыя ўмовы. Наваабраныя парламенты 21–22 ліпеня абвясцілі ўстанову Літоўскай, Латвійскай і Эстонскай Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і папрасілі прыняць іх у склад СССР. На што, зразумела, атрымалі згоду, адлюстраваную законамі ад 3 жніўня 1940 г. У адпаведнасці з законам разам з уключэннем Літвы ў склад СССР да новай савецкай рэспублікі далучаліся Свянцянскі раён і частка тэрыторыі з пераважным літоўскім насельніцтвам Відзаўскага, Воранаўскага, Астравецкага, Гадуцішкаўскага і Радуньскага раёнаў [1, с.244]. 25 лістапада 1940 г. выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб змяненні межаў асобных раёнаў Вілейскай і Беластоцкай абласцей у сувязі з удакладненнем мяжы паміж Літоўскай і Беларускай ССР». Такім чынам, ад БССР адрэзалі чарговыя 2,6 тыс. км² з 300 тыс. «пераважна літоўскім насельніцтвам» і перадалі іх Літве. Гэта рашэнне прымалася ў Маскве VII Надзвычайнай сэсіяй Вярхоўнага Савета СССР. Пасля перадачы Літве часткі беларускіх зямель плошча БССР склала 223 тыс. км²; насельніцтва – 10,2 млн. чалавек [8, с.127].

Нечарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР 12 лістапада 1939 г. прыняла закон, згодна з якім у Заходняй Беларусі было створана пяць абласцей – Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская, а 15 студзеня 1940 г. замест старых паветаў у заходніх абласцях быў утвораны 101 раён [2, с.6].

Варта адзначыць, што мяжа паміж заходнімі і ўсходнімі абласцямі БССР захоўвалася да пачатку Вялікай Айчыннай войны і для яе перасячэння патрабаваліся важкія прычыны. Пашпартны аддзел НКУС толькі пасля праверкі асобы выдаваў грамадзянам дазвол на выезд з Заходняй Беларусі ва ўсходнія вобласці БССР (і наадварот) [7, с.16].

Вывучэнне гістарычных перадумоў і асноўных дагавароў прыводзіць да высновы, што вырашэнне праблемы беларуска-польскай мяжы было падпарадкавана геапалітычным інтарэсам вялікіх дзяржаваў. Законнасць заключэння дагавораў аб ненападзе паміж краінамі ніколі не ставілася пад сумнеў у старым міжнародным праве. Аб’яднанне беларускіх зямель у 1939 г. аб’ектыўна адпавядала нацыянальным інтэрэсам беларусаў, але «свабоднае волевыяўленне насельніцтва» адбывалася адпаведна цалкам пад кантролем камуністычнай партыі. Негледзячы на гэта, ўваходжанне Заходняй Беларусі ў

склад СССР стала адной з найбольш значных падзей у гісторыі беларускага народа.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Барабаш В.В. Национально-территориальные преобразования в Западной Беларуси после воссоединения с БССР (1939–1940 гг.) // Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі. Мінск, 2010. С. 241 – 247.
2. Доўнар Т.І. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР // Юстыцыя Беларусі.2009. №4. С. 1 – 6.
3. Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.). Мінск: БДУ, 2003.
4. Макарчук В.С. Государственно-территориальный статус западноукраинских земель в период Второй мировой войны: Историко-правовое исследование.М., 2010. С.520.
5. Пронин А.А. Советско-германские соглашения 1939 г. Истоки и последствия. Екатеринбург: УрГЮА, 1998.
6. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921-1953 гг. В 2 кн. Кн. 2. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т. истории / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. Минск, 2014.
7. Смалянчук А. Верасень 1939 года як месца памяці беларусаў // Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі. Мінск: Зміцер Колас, 2015. С. 11 – 21.
8. Харченко О.П. Кадровая политика ЦК ВКП(б) по созданию и формированию аппарата управления в западных областях Беларуси // 1939 год у лёсе беларускага народа: зб. мат. рэг. кр. ст. / БрДУ імя А.С. Пушкіна. Брэст, 2010. С. 126 – 131.